

# 22 мая
# Міжнародны дзень біялагічнай разнастайнасці

# 22 мая – Міжнародны дзень біялагічнай разнастайнасці

Міжнароднага дня біялагічнай разнастайнасці быў абвешчаны Генеральнай Асамблеяй ААН у 2001 годзе. А яшчэ раней, у 1992 годзе, у Рыа-дэ-Жанэйра на другой Сусветнай канферэнцыі па ўстойлівым развіцці была прынята Канвенцыя ААН аб біялагічнай разнастайнасці. У ёй утрымліваўся заклік да прыняцця рашучых мер па захаванні ўсіх біялагічных відаў, пачынаючы з мікраскапічных і заканчваючы буйнымі прадстаўнікамі флоры і фаўны. Рэспубліка Беларусь ратыфікавала гэту канвенцыю 10 чэрвеня 1993 года.

***Галоўная задача Міжнароднага дня біялагічнай разнастайнасці – звярнуць увагу грамадскасці на праблему беззваротнага знікнення на Зямлі шматлікіх прадстаўнікоў флоры і фаўны і яшчэ раз нагадаць усёй сусветнай супольнасці пра неабходнасць прыняцця тэрміновых і рашучых мер для захавання экасістэм і біяразнастайнасці на міжнародным, нацыянальным і мясцовым узроўнях.***

***Біялагічная разнастайнасць – гэта ўся разнастайнасць жыцця на планеце, усе існыя і суіснуючыя прыродныя экасістэмы. Багацце і разнастайнасць усяго жывога на Зямлі з'яўляецца асновай жыцця і адной з найважнейшых крыніц устойлівага развіцця чалавецтва. Бяседавіцкая бібліятэка флоры і фаўны заклікае задумацца аб тым уздзеянні, якое аказвае чалавек на прыроду Зямлі.***